Рэспубліканская алімпіяда
па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура»

**Крытэрыі ацэнкі конкурсу «Водгук на мастацкі твор»**

*Максімальная колькасць балаў – **40***

| | |
|---|---|
| **I. УМЕННЕ ВЫЯЎЛЯЦЬ АСНОЎНУЮ ТЭМАТЫКУ І ПРАБЛЕМАТЫКУ, ІДЭЮ ТВОРА, АЎТАРСКУЮ ПАЗІЦЫЮ (4 БАЛЫ)** | |
| **4 б.** | *аўтар правільна разумее і вызначае тэму, ідэю і кола праблем твора, дакладна вызначае і абгрунтоўвае аўтарскую пазіцыю* |
| **3 б.** | *аўтар часткова разумее і не зусім поўна вызначае тэму, ідэю і кола праблем твора, недастаткова поўна асвятляе аўтарскую пазіцыю* |
| **2 б.** | *аўтар прыблізна разумее і вызначае тэму, ідэю і кола праблем твора, асвятляе асобныя палажэнні аўтарскай пазіцыі* |
| **1 б.** | *аўтар не разумее тэму і ідэю твора, не вызначае кола праблем твора, не вызначае аўтарскую пазіцыю* |
| **II. УМЕННЕ АБГРУНТОЎВАЦЬ ПРАЧЫТАНАЕ (7 БАЛАЎ)** | |
| **7 б.** | *аўтар дакладна і вычарпальна абгрунтоўвае ўласнае прачытанне твора; мае багаты чытацкі вопыт (прыводзіць звесткі пра аўтара, паралелі з іншымі творамі, спасылкі на іншых аўтараў, цытаты і інш.); дарэчна выкарыстоўвае ілюстрацыйны матэрыял, а таксама мэтазгодную і эфектыўную сістэму абгрунтавання ўласных высноў* |
| **6 б.** | *аўтар дакладна абгрунтоўвае ўласнае прачытанне твора; мае пэўны чытацкі вопыт (несістэмна прыводзіць паралелі з іншымі творамі, спасылкі на іншых аўтараў, цытаты і інш.); у асноўным дарэчна выкарыстоўвае ілюстрацыйны матэрыял; выкарыстоўвае мэтазгодную і эфектыўную сістэму абгрунтавання ўласных высноў* |
| **5 б.** | *у рабоце маюцца цікавыя назіранні над творам, якія не заўсёды пацвярджаюцца сістэмай доказаў; аўтар мае абмежаваны чытацкі вопыт (эпізадычна прыводзяцца паралелі з іншымі творамі, цытаты іншых аўтараў і інш.); сістэма абгрунтавання ўласных высноў не заўсёды эфектыўная* |
| **4 б.** | *у рабоце маюцца ацэнкі асобных (2–3) аўтарскіх перакананняў, думак, разважанняў; аўтар мае абмежаваны чытацкі вопыт (эпізадычна прыводзяцца паралелі з іншымі творамі, цытаты іншых аўтараў і інш.); сістэма абгрунтавання ўласных высноў не заўсёды эфектыўная* |
| **3 б.** | *у рабоце маюцца асобныя цікавыя назіранні над творам, пры гэтым аўтар выкарыстоўвае неэфектыўную сістэму абгрунтавання ўласных высноў; аўтар мае невялікі чытацкі вопыт (адзінкавыя прыклады паралелей з іншымі творамі, цытат іншых аўтараў і інш.)* |
| **2 б.** | *у рабоце пераважна адсутнічае сістэма абгрунтавання ўласных высноў або яна зводзіцца да пераказу зместу, недарэчнага цытавання твораў вядомых аўтараў, маюцца істотныя фактычныя, лагічныя памылкі ў аргументацыйнай частцы; аўтар мае малы чытацкі вопыт, асабістыя ацэнкі маюць недакладны, спрошчаны характар* |
| **1 б.** | *у рабоце адсутнічае сістэма абгрунтавання ўласных высноў, змест работы зводзіцца да канстатацыі фактаў, недарэчнага цытавання твораў вядомых аўтараў, маюцца істотныя фактычныя, лагічныя памылкі ў аргументацыйнай частцы; аўтар не дэманструе чытацкі вопыт, асабістыя ацэнкі маюць недакладны, спрошчаны характар* |

| | |
|---|---|
| **III. УМЕННЕ ВЫЗНАЧАЦЬ РОЛЮ СЮЖЭТА, КАМПАЗІЦЫІ, ВЫЯЎЛЕНЧЫХ СРОДКАЎ ВЫРАЗНАСЦІ (8 БАЛАЎ)** | |
| **8 б.** | *аўтар дакладна вызначае асаблівасці кампазіцыі твора, яго сюжэтных ліній, сістэмы вобразаў, выяўленчых сродкаў выразнасці і дае іх цікавую, арыгінальную інтэрпрэтацыю, правільна характарызуе фармальныя паказчыкі арганізацыі твора* |
| **7 б.** | *аўтар у асноўным дакладна вызначае асаблівасці кампазіцыі твора, яго сюжэтных ліній, сістэмы вобразаў, выяўленчых сродкаў выразнасці, але дапускае не больш за 1 недахоп у іх вызначэнні і інтэрпрэтацыі; у асноўным правільна характарызуе фармальныя паказчыкі арганізацыі твора* |
| **6 б.** | *аўтар у асноўным дакладна вызначае асаблівасці кампазіцыі твора, яго сюжэтных ліній, сістэмы вобразаў, выяўленчых сродкаў выразнасці, але дапускае не больш за 2 недахопы ў іх вызначэнні і інтэрпрэтацыі, у асноўным правільна характарызуе фармальныя паказчыкі арганізацыі твора, але дапускае не больш за 2 недахопы* |
| **5 б.** | *аўтар у асноўным дакладна вызначае асаблівасці кампазіцыі твора, яго сюжэтных ліній, сістэмы вобразаў, мастацкіх сродкаў выразнасці, але дапускае не больш за 3 недахопы ў іх вызначэнні і інтэрпрэтацыі, у асноўным правільна характарызуе фармальныя паказчыкі арганізацыі твора, але дапускае не больш за 3 недахопы* |
| **4 б.** | *аўтар правільна вызначае ролю толькі асобных элементаў кампазіцыі твора, яго сюжэтных ліній, сістэмы вобразаў, называе некаторыя выяўленчыя сродкі выразнасці, але дапускае не больш за 4 недахопы ў іх вызначэнні і інтэрпрэтацыі, характарызуе фармальныя паказчыкі арганізацыі твора, але дапускае не больш за 4 недахопы* |
| **3 б.** | *аўтар правільна вызначае ролю толькі асобных элементаў кампазіцыі твора, яго сюжэтных ліній, сістэмы вобразаў, называе некаторыя выяўленчыя сродкі выразнасці, але дапускае больш за 4 недахопы ў іх вызначэнні і інтэрпрэтацыі, у асноўным правільна характарызуе фармальныя паказчыкі арганізацыі твора, але дапускае больш за 4 недахопы* |
| **2 б.** | *аўтар няправільна або зусім не вызначае ролю кампазіцыі твора, яго сюжэтных ліній, сістэмы вобразаў, называе некаторыя выяўленчыя сродкі выразнасці, але дапускае больш за 4 недахопы ў іх вызначэнні і інтэрпрэтацыі, няправільна характарызуе фармальныя паказчыкі арганізацыі твора* |
| **1 б.** | *аўтар абмяжоўваецца пералічэннем выяўленчых сродкаў выразнасці без абгрунтавання іх ролі ў мастацкім творы, зусім не характарызуе фармальныя паказчыкі арганізацыі вершаванага твора (памер, рыфму, рытм і інш.)* |
| **IV. МОЎНАЕ І КАМПАЗІЦЫЙНАЕ АФАРМЛЕННЕ ВОДГУКУ (7 БАЛАЎ)** | |
| **7 б.** | *работа характарызуецца багаццем слоўніка і разнастайнасцю выкарыстаных моўных сродкаў, дакладнасцю, лагічнасцю, дарэчнасцю, выразнасцю словаўжывання; прадуманасцю кампазіцыі (адпаведнасць кампазіцыі водгуку асаблівасцям тыпу і жанру маўлення); захоўваецца паслядоўнасць у развіцці асноўнай думкі; дапускаецца не больш за 1 маўленчы недахоп – парушэнне логікі выкладу матэрыялу або стылявога адзінства тэксту* |
| **6 б.** | *работа характарызуецца багаццем слоўніка і разнастайнасцю выкарыстаных моўных сродкаў, дакладнасцю, лагічнасцю, дарэчнасцю, выразнасцю словаўжывання; прадуманасцю кампазіцыі (адпаведнасць кампазіцыі водгуку асаблівасцям тыпу і жанру маўлення); захоўваецца паслядоўнасць у развіцці асноўнай думкі; дапускаецца не больш за 2 маўленчыя недахопы, у тым ліку парушэнняў дакладнасці словаўжывання, логікі выкладу матэрыялу, стылявога адзінства* |
| **5 б.** | *работа характарызуецца багаццем слоўніка і разнастайнасцю выкарыстаных моўных сродкаў, дакладнасцю, агульнай лагічнасцю словаўжывання; адзначаюцца нязначныя парушэнні кампазіцыйных частак, у асноўным захоўваецца паслядоўнасць у развіцці асноўнай думкі; дапускаецца не больш за 3 маўленчыя недахопы, у тым ліку парушэнні дакладнасці словаўжывання, логікі выкладу матэрыялу, стылявога адзінства* |
| **4 б.** | *работа характарызуецца багаццем слоўніка і разнастайнасцю выкарыстаных моўных сродкаў, дакладнасцю, агульнай лагічнасцю словаўжывання; адзначаюцца нязначныя* |

| | |
|---|---|
| | *парушэнні кампазіцыйных частак, у асноўным захоўваецца паслядоўнасць у развіцці асноўнай думкі; дапускаецца не больш за 4 маўленчыя недахопы, у тым ліку парушэнні дакладнасці словаўжывання, логікі выкладу матэрыялу, стылявога адзінства* |
| 3 б. | *работа характарызуецца багаццем слоўніка і разнастайнасцю выкарыстаных моўных сродкаў, дакладнасцю, агульнай лагічнасцю словаўжывання; адзначаюцца нязначныя парушэнні кампазіцыйных частак, у асноўным захоўваецца паслядоўнасць у развіцці асноўнай думкі; дапускаецца не больш за 6 маўленчых недахопаў, у тым ліку парушэнняў дакладнасці словаўжывання, логікі выкладу матэрыялу, стылявога адзінства* |
| 2 б. | *работа вызначаецца разнастайнасцю выкарыстаных моўных сродкаў, дакладнасцю, выразнасцю словаўжывання; маюцца парушэнні суразмернасці кампазіцыйных частак, пры гэтым прасочваецца іх агульная сэнсавая сувязь і паслядоўнасць у развіцці асноўнай думкі; дапускаецца не больш за 8 маўленчых недахопаў, у тым ліку парушэнняў дакладнасці словаўжывання, логікі выкладу матэрыялу, стылявога адзінства* |
| 1 б. | *работа характарызуецца беднасцю слоўнікавага запасу, аднатыпнасцю сінтаксічных канструкцый; маюцца парушэнні жанравай цэласнасці водгуку, патрабаванняў да яго структуры (адсутнасць уступу або заключэння) і стылю; назіраюцца парушэнні паслядоўнасці ў развіцці асноўнай думкі, а таксама лагічнай сувязі кампазіцыйных частак, іх несуразмернасць; дапускаецца больш за 8 маўленчых недахопаў* |
| **V. ПІСЬМЕННАСЦЬ (10 БАЛАЎ)** | |
| 10б. | *0/0, 1/0 (нягрубая), 0/1 (нягрубая)* |
| 9 б. | *0/2, 1/0, 1/1, 0/1 і не больш за 1 граматычную памылку* |
| 8 б. | *0/3, 2/0, 2/1, 1/2 і да 2 граматычных памылак* |
| 7 б. | *0/4, 1/3, 2/2, 3/0, 3/1 і да 3 граматычных памылак* |
| 6 б. | *0/5, 1/4, 2/3, 3/2, 4/0, 4/1 і да 4 граматычных памылак* |
| 5 б. | *0/6, 1/5, 2/4, 3/3, 4/2, 5/0, 5/1 і да 5 граматычных памылак* |
| 4 б. | *0/7, 1/6, 2/5, 3/4, 4/3, 5/2, 6/1, 6/0 і да 6 граматычных памылак* |
| 3 б. | *0/8, 0/9, 1/7, 1/8, 2/6, 2/7, 3/5, 3/6, 4/4, 4/5, 5/3, 5/4, 6/3, 6/2, 7/2, 7/1, 7/0, 8/1, 8/0 і да 8 граматычных памылак* |
| 2 б. | *0/11, 0/10, 1/10, 1/9, 2/9, 2/8, 3/8, 3/7, 4/7, 4/6, 5/6, 5/5, 6/5, 6/4, 7/4, 7/3, 8/3, 8/2, 9/2, 9/1, 10/1, 10/0, 9/0 і да 10 граматычных памылак* |
| 1 б. | *больш як на 2 балы* |
| **VI. ТВОРЧЫ ХАРАКТАР РАБОТЫ (4 БАЛЫ)** | |
| 4 б. | *у рабоце прадстаўлена арыгінальная трактоўка, якая не пярэчыць сутнасным характарыстыкам мастацкага твора; аўтар дэманструе навуковы кругагляд; работа выканана ў нестандартнай форме, мэтазгоднай, дарэчнай і эфектыўнай для дасягнення пастаўленых камунікатыўных задач* |
| 3 б. | *у рабоце прадстаўлена арыгінальная трактоўка, якая не пярэчыць сутнасным характарыстыкам мастацкага твора; аўтар дэманструе навуковы кругагляд; работа выканана ў стандартнай форме, эфектыўнай для дасягнення пастаўленых камунікатыўных задач* |
| 2 б. | *у рабоце прадстаўлены асобныя цікавыя і арыгінальныя назіранні, гісторыка-культурныя параўнанні, паралелі з іншымі творамі; выкарыстана стандартная традыцыйная форма водгуку, якая ў цэлым спрыяе эфектыўнаму вырашэнню пастаўленых камунікатыўных задач* |
| 1 б. | *у рабоце прадстаўлены спрошчаныя, традыцыйныя высновы; абраная аўтарам форма і сродкі неэфектыўна вырашаюць пастаўленыя камунікатыўныя задачы* |